цягне накладанне штрафу на грамадзян у размеры ад дзвюх да пяці мінімальных заработных плат, на службовых асоб — у размеры ад пяці да трыццаці мінімальных заработных плат.

Учыненне парушэння, прадугледжанага часткай першай гэтага артыкула, паўторна на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання —

цягне накладанне штрафу на грамадзян у размеры ад пяці да дзесяці мінімальных заработных плат, на службовых асоб у размеры ад дзесяці да пяцідзесяці мінімальных заработных плат".

10. Артыкул 166^{6} выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"Артыкул 166^{6}. Непадпарадкаванне законнаму патрабаванню работніка Дэпартамента эканамічнага кантролю пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь

Непадпарадкаванне законнаму патрабаванню работніка Дэпартамента эканамічнага кантролю пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь пры выкананні ім сваіх абавязкаў —

цягне накладанне штрафу ў размеры да трох мінімальных заработных плат".

11. У артыкуле 171:

з пункта першага выключыць слова "СССР";

у санкцыі артыкула словы "на службовых асоб у размеры да пяцісот рублёў" замяніць словамі "ў размеры да дзвюх мінімальных заработных плат".

12. З частак першай і другой артыкула 199 і часткі першай артыкула 200 выключыць лічбы "150".

13. У артыкуле 202:

лічбы "148^{2}" выключыць;

пасля лічбаў "149" дапоўніць артыкул словамі "154 (акрамя заняцця прадпрымальніцкай дзейнасцю без дзяржаўнай рэгістрацыі, а таксама ажыццяўлення дзейнасці, заняцце якой забаронена, або ажыццяўлення дзейнасці, што патрабуе спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), без наяўнасці такога дазволу) і артыкуламі 155^{7}".

14. Артыкул 224^{2} выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"Артыкул 224^{2}. Органы Дэпартамента эканамічнага кантролю пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь

Органы Дэпартамента эканамічнага кантролю пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь разглядаюць справы аб адміністрацыйных правапарушэннях, прадугледжаных артыкуламі 46^{2}, 144, 144^{1}, 145, часткай другой артыкула 148, часткай другой артыкула 154, артыкуламі 155^{4}, 155^{5}, 155^{6}, 155^{7}, 166^{6} і артыкулам 171 гэтага Кодэкса (у выпадках выяўлення гэтых парушэнняў работнікамі Дэпартамента эканамічнага кантролю пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь).

Разглядаць справы аб адміністрацыйных правапарушэннях і накладаць адміністрацыйныя спагнанні ад імя органаў Дэпартамента эканамічнага кантролю пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь маюць права:

дырэктар Дэпартамента эканамічнага кантролю пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, яго намеснікі, начальнікі ўпраўленняў і інспекцый, іх намеснікі, начальнікі галоўных упраўленняў эканамічнага кантролю ў абласцях і горадзе Мінску, іх намеснікі".

15. У частцы першай артыкула 224^{4} словы "артыкуламі 154" замяніць словамі "артыкулам 154 (акрамя заняцця прадпрымальніцкай дзейнасцю без дзяржаўнай рэгістрацыі, а таксама ажыццяўлення дзейнасці, заняцце якой забаронена, або ажыццяўлення дзейнасці, што патрабуе спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), без наяўнасці такога дазволу), артыкуламі".

16. У артыкуле 234^{1}:

у абзацы другім пункта 1 часткі першай лічбы "145—150" замяніць лічбамі "145—149"; гэты ж абзац пасля лічбы "152" і абзац трэці пункта 1 часткі першай пасля лічбы "140—143" дапоўніць адпаведна словамі "154 (акрамя заняцця прадпрымальніцкай дзейнасцю без дзяржаўнай рэгістрацыі, а таксама ажыццяўлення дзейнасці, заняцце якой забаронена, або ажыццяўлення дзейнасці, што патрабуе спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), без наяўнасці такога дазволу)";

абзац шаснаццаты пункта 1 часткі першай выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"органаў Дэпартамента эканамічнага кантролю пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (артыкулы 46^{2}, 144, 144^{1}, 145, частка другая артыкула 148, частка другая артыкула 154, артыкулы 155^{4}, 155^{5}, 155^{6}, 155^{7}, 166^{6} і 171)";

пункт 1 часткі першай пасля апошняга абзаца дапоўніць новым абзацам наступнага зместу:

"органаў, упаўнаважаных заканадаўствам выдаваць суб'ектам гаспадарання спецыяльныя дазволы (ліцэнзіі) на ажыццяўленне асобных відаў дзейнасці (частка першая артыкула 154 — у частцы парушэння ўмоў і правіл ажыццяўлення відаў дзейнасці, прадугледжаных у спецыяльных дазволах (ліцэнзіях))";

у абзацы другім пункта 2 часткі другой словы "па артыкуле 154" замяніць словамі "частка першая артыкула 154 (у частцы заняцця прадпрымальніцкай дзейнасцю без дзяржаўнай рэгістрацыі, а таксама ажыццяўлення дзейнасці, заняцце якой забаронена, або ажыццяўлення дзейнасці, што патрабуе спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), без наяўнасці такога дазволу), артыкул";

абзац другі пункта 2 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"пазаштатны інспектар Дэпартамента эканамічнага кантролю пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (артыкулы 46^{2}, 144, 144^{1}, 145, частка другая артыкула 148, частка другая артыкула 154, артыкулы 155^{4}, 155^{5}, 155^{6}, 155^{7} і 171)".

17. З часткі другой артыкула 247 і часткі першай артыкула 274 выключыць лічбы "148^{2}"; пасля лічбаў "149" дапоўніць гэтыя часткі словамі "154 (акрамя заняцця прадпрымальніцкай дзейнасцю без дзяржаўнай рэгістрацыі, а таксама ажыццяўлення дзейнасці, заняцце якой забаронена, або ажыццяўлення дзейнасці, што патрабуе спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), без наяўнасці такога дазволу), а таксама артыкуламі 155^{7}".

18. З часткі другой артыкула 257 выключыць лічбы "148^{2}"; пасля лічбаў "149" дапоўніць гэту частку лічбамі "155^{7}".

19. У артыкуле 291:

з абзаца другога выключыць лічбы "148^{2}";

абзац другі пасля лічбаў "149" дапоўніць словамі "154 (акрамя заняцця прадпрымальніцкай дзейнасцю без дзяржаўнай рэгістрацыі, а таксама ажыццяўлення дзейнасці, заняцце якой забаронена, або ажыццяўлення дзейнасці, што патрабуе атрымання спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), без наяўнасці такога дазволу), а таксама артыкуламі";

дапоўніць артыкул пасля апошняга абзаца новымі абзацамі наступнага зместу:

"упаўнаважанымі на тое асобамі органаў Дэпартамента эканамічнага кантролю пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь — пры ўчыненні правапарушэнняў, прадугледжаных часткай другой артыкула 144, часткай другой артыкула 154;

упаўнаважанымі на тое асобамі органаў Дзяржаўнай падатковай інспекцыі Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь — пры ўчыненні правапарушэнняў, прадугледжаных часткай першай артыкула 154 гэтага Кодэкса ў частцы заняцця прадпрымальніцкай дзейнасцю без дзяржаўнай рэгістрацыі, а таксама ажыццяўлення дзейнасці, што патрабуе атрымання спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), без наяўнасці такога дазволу".

II. Гэты Закон увесці ў дзеянне з 1 ліпеня 1993 года.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С.ШУШКЕВІЧ.

18 чэрвеня 1993 г.
г.Мінск.
№ 2439-XII

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб мясцовым самакіраванні і мясцовай гаспадарцы ў Рэспубліцы Беларусь"

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 лютага 1991 года "Аб мясцовым самакіраванні і мясцовай гаспадарцы ў Рэспубліцы Беларусь" (Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., № 11, арт. 122) наступныя змяненні і дапаўненні:

1. Частку трэцюю артыкула 2 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"Са згоды мясцовых Саветаў народных дэпутатаў аднайменныя адміністрацыйныя адзінкі, якія маюць агульны адміністрацыйны цэнтр, могуць быць аб'яднаны ў адну ва ўстаноўленым парадку Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па прадстаўленню Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Пры аб'яднанні такіх мясцовых Саветаў народных дэпутатаў пытанні кампетэнцыі аб'яднанага Савета вызначаюцца ў адпаведнасці з гэтым Законам".

2. У артыкуле 5:

у частцы чацвёртай словы "(без раённага дзялення)" замяніць словамі "(гарадоў раённага падпарадкавання)";

у частцы пятай словы "(з раённым дзяленнем)" замяніць словамі "(гарадоў абласнога падпарадкавання)".

3. У пункце 2 артыкула 8:

у падпункце 3 выключыць словы "і штатаў";

у падпункце 6 выключыць словы "назначэнне на пасады і вызваленне ад пасад іх кіраўнікоў";

падпункт 17 выключыць;

з падпункта 20 выключыць словы "акцый, мясцовых грашова-рэчавых латарэй і правядзенні аўкцыёнаў".

4. У артыкуле 9:

у частцы першай выключыць слова "штаты";

частку другую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"Арганізацыйна-тэхнічнае абслугоўванне дзейнасці мясцовага Савета і створаных ім органаў забяспечваецца яго выканаўчым камітэтам".

5. Частку першую артыкула 13 дапоўніць сказам наступнага зместу: "У сельскіх Саветах народных дэпутатаў пастаянныя камісіі могуць не ўтварацца".

6. У артыкуле 14:

у пункце 2:

падпункт 4 дапоўніць наступнымі словамі: "прымае рашэнні аб выпуску мясцовых каштоўных папер, грашова-рэчавых латарэй і правядзенні аўкцыёнаў";

падпункт 6 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"6) прымае рашэнні аб утварэнні, рэарганізацыі і ліквідацыі прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў, якія належаць адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму ўтварэнню на праве камунальнай уласнасці; зацвярджае рэжым работы такіх прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў, а таксама ўзгадняе рэжым работы іншых прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый незалежна ад формы ўласнасці, якія размешчаны на тэрыторыі Савета";

падпункт 11 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"11) вызначае штаты выканаўчага камітэта, створаных ім аддзелаў, упраўленняў і іншых падраздзяленняў, кіруе імі і падведамнымі арганізацыямі. Па ўзгадненню з адпаведнымі аддзеламі і ўпраўленнямі выканаўчага камітэта вышэйстаячага Савета (міністэрствамі, ведамствамі) назначае на пасаду і вызваляе ад пасады кіраўнікоў аддзелаў, упраўленняў і іншых падраздзяленняў выканаўчага камітэта. Назначае на пасаду і вызваляе ад пасады іншых работнікаў апарата выканаўчага камітэта, кіраўнікоў падведамных арганізацый";

падпункт 20 дапоўніць словамі "мае права прыцягваць насельніцтва да выканання неадкладных грамадска неабходных работ, а таксама матэрыяльна-тэхнічныя рэсурсы прадпрыемстваў і арганізацый незалежна ад формы ўласнасці, якія размешчаны на тэрыторыі Савета, для ліквідацыі аварый, стыхійных бедстваў і катастроф".

7. У артыкуле 15:

дапоўніць пасля часткі другой новай часткай наступнага зместу:

"Мясцовыя Саветы народных дэпутатаў кіруюцца ў сваёй дзейнасці дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкай Рэспублікі Беларусь і прымаюць актыўны ўдзел у яе фарміраванні і рэалізацыі";

частку трэцюю выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"Мясцовыя Саветы назначаюць на пасаду і вызваляюць ад пасады кіраўнікоў прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў, якія адносяцца да камунальнай уласнасці адпаведнага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўтварэння, а таксама ўзгадняюць назначэнне на пасаду і вызваленне ад пасады кіраўнікоў іншых дзяржаўных прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў, якія размешчаны на тэрыторыі Савета";

у частцы чацвёртай выключыць словы "выключна";

часткі трэцюю, чацвёртую, пятую, шостую лічыць адпаведна часткамі чацвёртай, пятай, шостай і сёмай.

8. У артыкуле 16:

з абзаца першага пункта 2 выключыць словы "гарадоў абласнога падпарадкавання (без раённага дзялення) і".

9. Артыкул 17 пасля пункта 1 дапоўніць пунктам наступнага зместу:

"2. Гарадскі (горада абласнога падпарадкавання без раённага дзялення) Савет адначасова ажыццяўляе і паўнамоцтвы, прадугледжаныя пунктам 1 артыкула 16 і пунктам 1 артыкула 35 гэтага Закона";

пункт 2 лічыць пунктам 3.

10. У апошнім сказе часткі першай артыкула 28 выключыць словы "колькасць работнікаў".

11. Дапоўніць пункт 2 артыкула 29 пасля падпункта 1 новым падпунктам наступнага зместу:

"2) каардынаваць дзейнасць прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў рэгіёна ў асваенні новых тэхналогій, умацоўваць іх сувязі з навуковымі ўстановамі і арганізацыямі, удасканальваць арганізацыю вытворчасці";

падпункт 2 лічыць падпунктам 3.

12. Падпункт 4 у пункце 1 артыкула 36 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"4) устанаўліваюць памер расходаў на ўтрыманне органаў мясцовага самакіравання, у тым ліку фонд аплаты працы, зыходзячы з службовых акладаў і ўмоў матэрыяльнага заахвочвання, устаноўленых дзеючым заканадаўствам".

13. Падпункт 7 пункта 1 артыкула 37 выключыць.

14. Пункт 1 артыкула 41 дапоўніць часткай другой наступнага зместу:

"У выпадках, калі мясцовыя Саветы народных дэпутатаў не даюць згоды на размяшчэнне ці рэканструкцыю прадпрыемстваў і іншых аб'ектаў агульнарэспубліканскага значэння, нягледзячы на забеспячэнне экалагічных і іншых сацыяльна значных нарматываў, устаноўленых дзеючым заканадаўствам, канчатковае рашэнне прымаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь".

15. У артыкуле 42:

у частцы першай словы "не павінны супярэчыць законам" замяніць словамі "павінны адпавядаць заканадаўству";

у частцы трэцяй словы "супярэчаць закону" замяніць словамі "не адпавядаюць заканадаўству".

16. У артыкуле 43:

пасля часткі другой дабавіць часткі наступнага зместу:

"За невыкананне рашэнняў мясцовых органаў дзяржаўнай улады і кіравання, прынятых у межах іх кампетэнцыі, кіраўнікі дзяржаўных прадпрыемстваў і арганізацый, што размешчаны на падведамнай тэрыторыі і не належаць да іх камунальнай уласнасці, могуць адхіляцца ад пасады выканаўчымі камітэтамі мясцовых Саветаў абласнога і базавага тэрытарыяльных узроўняў з унясеннем у адпаведны орган прапаноў аб вызваленні гэтых кіраўнікоў ад займаемай пасады.

У выпадку парушэння службовымі асобамі выканаўчых органаў мясцовых Саветаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь, невыканання рашэнняў вышэйстаячых органаў дзяржаўнай улады і кіравання, прынятых у межах іх кампетэнцыі, яны могуць быць адхілены ад выканання абавязкаў старшынёй вышэйстаячага Савета з унясеннем ім прапаноў у адпаведны орган аб вызваленні гэтых службовых асоб ад пасады";

у частцы чацвёртай словы "супярэчаць закону" замяніць словамі "не адпавядаюць заканадаўству";

частку сёмую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"За невыкананне рашэнняў Савета і яго органаў, прынятых у межах іх кампетэнцыі, службовыя асобы арганізацый, размешчаных на падведамнай Савету тэрыторыі, а таксама грамадзяне нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам";

часткі трэцюю, чацвёртую, пятую, шостую, сёмую лічыць адпаведна часткамі пятай, шостай, сёмай, восьмай, дзевятай.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С.ШУШКЕВІЧ.

17 чэрвеня 1993 г.
г.Мінск.
№ 2424-XII

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб унясенні дапаўненняў і змянення ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях

У адпаведнасці з Законамі Рэспублікі Беларусь "Аб Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь" і "Аб банках і банкаўскай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь" Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Унесці ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, прыняты Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь 6 снежня 1984 года (33 БССР, 1984 г., N 35, арт. 505; 1986 г., N 28, арт. 362; Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1991 г., N 36, арт. 633; 1992 г., N 33, арт. 527, N 34, арт. 537; 1993 г., N 7, арт. 39), наступныя дапаўненні і змяненне:

1. Дапоўніць Кодэкс артыкуламі 151^{1}—151^{10}, 154^{2}, 155^{8} і 224^{10} наступнага зместу:

"Артыкул 151^{1}. Парушэнне ўстаноўленага парадку правядзення валютных аперацый

Парушэнне службовай асобай устаноўленага парадку правядзення валютных аперацый, гэта значыць скупкі, продажу, абмену або выкарыстання замежнай валюты ў якасці плацяжу, плацежных дакументаў у замежнай валюце і іншых замежных грашовых дакументаў, якія ажыццяўляюцца без спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), —

цягне накладанне штрафу ў размеры да пятнаццаці мінімальных заработных плат.

Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання, —

цягнуць накладанне штрафу ў размеры ад пятнаццаці да дваццаці мінімальных заработных плат.

Артыкул 151^{2}. Невыкананне банкамі абавязкаў па кантролю за захаваннем парадку вядзення касавых аперацый і выдачы наяўных грошай.

Невыкананне службовымі асобамі банкаў абавязкаў па кантролю за захаваннем гаспадарніцкімі суб'ектамі парадку вядзення касавых аперацый, бескантрольная выдача кліентам наяўных грошай —

цягне накладанне штрафу ў размеры да пятнаццаці мінімальных заработных плат.

Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна па працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання, —

цягнуць накладанне штрафу ў размеры ад пятнаццаці да дваццаці мінімальных заработных плат.

Артыкул 151^{3}. Парушэнне парадку вядзення бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці або знішчэнне дакументаў

Грубае парушэнне кіраўніком, галоўным бухгалтарам або іншай службовай асобай гаспадарніцкага суб'екта парадку вядзення бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці або знішчэнне бухгалтарскіх дакументаў да заканчэння ўстаноўленых тэрмінаў іх захоўвання, утойванне —

цягне накладанне штрафу ў размеры да пятнаццаці мінімальных заработных плат.

Артыкул 151^{4}. Непаведамленне аб змяненнях, якія ўносяцца ва ўстаноўчыя дакументы банка

Непаведамленне кіраўніком праўлення (дырэкцыі) банка ў месячны тэрмін пісьмова Нацыянальнаму банку Рэспублікі Беларусь аб усіх змяненнях, якія ўносяцца ва ўстаноўчыя дакументы банка, —

цягне накладанне штрафу ў размеры ад дзесяці да дваццаці мінімальных заработных плат.

Артыкул 151^{5}. Стварэнне ўмоў, якія перашкаджаюць правядзенню праверак і рэвізій

Перашкода службовымі асобамі гаспадарніцкіх суб'ектаў ажыццяўленню ўпаўнаважанымі асобамі банкаў праверак, рэвізій, непрадстаўленне дакументаў, неабходных для выканання ліцэнзійных і наглядных функцый, —

цягне накладанне штрафу ў размеры да дваццаці мінімальных заработных плат.

Артыкул 151^{6}. Ажыццяўленне банкамі інвестыцый у статутныя фонды без узгаднення з Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь

Ажыццяўленне банкамі інвестыцый у статутныя фонды прадпрыемстваў, арганізацый, кааператываў і іншых юрыдычных асоб без узгаднення з Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь —

цягне накладанне штрафу ў размеры да дваццаці мінімальных заработных плат.

Артыкул 151^{7}. Выдаванне тайны ўкладаў

Выдаванне служачымі банкаў тайны па аперацыях, рахунках і ўкладах кліентаў —

цягне накладанне штрафу ў размеры да дваццаці мінімальных заработных плат.

Артыкул 151^{8}. Незахаванне парадку страхавання дэпазітаў і ўкладаў

Незахаванне банкамі ўстаноўленага Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь парадку страхавання дэпазітаў і ўкладаў юрыдычных і фізічных асоб —

цягне накладанне штрафу ў размеры да дваццаці мінімальных заработных плат.

Артыкул 151^{9}. Адкрыццё і вядзенне рахункаў за межамі Рэспублікі Беларусь без спецыяльнага дазволу

Адкрыццё і вядзенне гаспадарніцкімі суб'ектамі і банкамі рахункаў за межамі Рэспублікі Беларусь без спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь —

цягне накладанне штрафу ў размеры да сарака мінімальных заработных плат.

Артыкул 151^{10}. Незаконны ўвоз гаспадарніцкімі суб'ектамі наяўных грашовых сродкаў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь і вываз за яе межы

Незаконны ўвоз гаспадарніцкімі суб'ектамі наяўных грашовых сродкаў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь і вываз за яе межы —

цягне накладанне штрафу на службовых асоб гаспадарніцкіх суб'ектаў у размеры да дваццаці мінімальных заработных плат.

Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання, —

цягнуць накладанне штрафу ў размеры ад дваццаці да пяцідзесяці мінімальных заработных плат".

"Артыкул 154^{2}. Незаконнае ажыццяўленне банкаўскіх аперацый і выкарыстанне слова "банк"

Ажыццяўленне юрыдычнымі і фізічнымі асобамі банкаўскіх аперацый без ліцэнзіі Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь і незаконнае выкарыстанне слова "банк" —

цягне накладанне штрафу ў размеры да дваццаці мінімальных заработных плат".

"Артыкул 155^{8}. Незаконны выпуск (эмісія) каштоўных папер

Незаконны выпуск (эмісія) каштоўных папер службовымі асобамі гаспадарніцкіх суб'ектаў і іх публічнае размяшчэнне без рэгістрацыі ва ўстаноўленым парадку —

цягне накладанне штрафу ў размеры да дваццаці мінімальных заработных плат".

"Артыкул 224^{10}. Органы Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь

Органы Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь разглядаюць справы аб адміністрацыйных правапарушэннях, прадугледжаных артыкуламі 151^{1} — 151^{10}, 154^{2} і 155^{8} гэтага Кодэкса.

Разглядаць справы аб адміністрацыйных правапарушэннях і накладаць адміністрацыйныя спагнанні ад імя органаў Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь маюць права:

старшыня праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь — штраф у размеры да сарака мінімальных заработных плат;

начальнікі галоўных упраўленняў Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь па абласцях, гораду Мінску і Мінскай вобласці — штраф у размеры да пятнаццаці мінімальных заработных плат".

2. У абзацы першым часткі другой артыкула 234^{1} словы "артыкулах 203—224^{9}" замяніць словамі "артыкулах 203—224^{10}".

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С.ШУШКЕВІЧ.

29 чэрвеня 1993 г.
г.Мінск.
№ 2454-XII

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь

У сувязі з прыняццем Закона Рэспублікі Беларусь ад 13 лістапада 1992 года "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе**:

Унесці змяненні і дапаўненні ў наступныя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь:

I. У назве, частках першай і другой артыкула 225 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, зацверджанага Законам Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 1960 года (33 БССР, 1961 г., N 1, арт. 4; 1988 г., N 3, арт. 34), словы "помнікаў гісторыі і культуры" замяніць словамі "гісторыка-культурных каштоўнасцей".

II. У Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, прынятым Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь 6 снежня 1984 года (33 БССР, 1984 г., N 35, арт. 505; 1986 г., N 28, арт. 362; 1987 г., N 22, арт. 282; 1988 г., N 10, арт. 156, N 12, арт. 194; 1989 г., N 10, арт. 94, N 35, арт. 386; Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., N 25, арт. 366):

1. Артыкул 89 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"Артыкул 89. Парушэнне заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны

Невыкананне абавязкаў па ахове, выкарыстанню, уліку, рэстаўрацыі і даследаванню гісторыка-культурнай спадчыны —

цягне папярэджанне ці накладанне штрафу ў размеры ад адной да васьмі мінімальных заработных плат.

Парушэнне правілаў рэжыму ўтрымання ахоўных зон, устаноўленых у мэтах забеспячэння аховы асяроддзя вакол матэрыяльных нерухомых каштоўнасцей, —

цягне накладанне штрафу ў размеры ад адной да шасці мінімальных заработных плат".

2. У артыкуле 234^{1}:

абзац трэці пункта 1 часткі першай пасля лічбаў "88" дапоўніць лічбамі "89";

абзац чатырнаццаты пункта 1 часткі першай выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"органаў Дзяржаўнай інспекцыі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны (арт. 89)";

з абзаца другога пункта 6 часткі першай выключыць лічбы "89".

III. Артыкул 10 Закона Рэспублікі Беларусь ад 11 снежня 1990 года "Аб уласнасці ў Рэспубліцы Беларусь" (Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1990 г., N 2, арт. 13) выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"Артыкул 10. Заканадаўчае рэгуляванне адносін уласнасці на гісторыка-культурныя каштоўнасці

Асаблівасці рэгулявання права ўласнасці на гісторыка-культурныя каштоўнасці вызначаюцца Законам Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" і іншым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь".

IV. У Законе Рэспублікі Беларусь ад 20 лютага 1991 года "Аб мясцовым самакіраванні і мясцовай гаспадарцы ў Рэспубліцы Беларусь" (Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., N 11 (13), арт. 122):

1. У пункце 5 часткі другой артыкула 22 словы "помнікі гісторыі і культуры" замяніць словамі "гісторыка-культурныя каштоўнасці".

2. У частцы першай артыкула 30 словы "гістарычнай спадчыны" замяніць словамі "гісторыка-культурнай спадчыны".

3. У падпункце 2 пункта 1 артыкула 36 словы "помнікаў гісторыі і культуры" замяніць словамі "гісторыка-культурных каштоўнасцей".

V. У абзацы другім часткі другой артыкула 17 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 снежня 1991 года "Аб плацяжах за зямлю" (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., N 3, арт. 49; 1993 г., N 3, арт. 29) словы "гісторыі і культуры" замяніць словамі "гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі".

VI. У пункце 22 часткі першай артыкула 5 Закона Рэспублікі Беларусь ад 19 снежня 1991 года "Аб падатку на дабаўленую вартасць" (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., N 3, арт. 51) словы "помнікаў гісторыі і культуры Беларусі" замяніць словамі "гісторыка-культурных каштоўнасцей".

VII. У частцы першай артыкула 5 Закона Рэспублікі Беларусь ад 16 красавіка 1992 года "Аб прыватызацыі жыллёвага фонду ў Рэспубліцы Беларусь" (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., N 15, арт. 247) словы "помнікамі гісторыі і культуры" замяніць словамі "гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі".

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С.ШУШКЕВІЧ.

11 чэрвеня 1993 г.
г.Мінск.
№ 2369-XII

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб прызнанні страціўшым сілу Закона Рэспублікі Беларусь "Аб мінімальнай заработнай плаце і дзяржаўных гарантыях у галіне аплаты працы"

У сувязі з прыняццем Закона Рэспублікі Беларусь ад 15 снежня 1992 г. "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс законаў аб працы Рэспублікі Беларусь" Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Прызнаць страціўшым сілу Закон Рэспублікі Беларусь ад 21 снежня 1991 г. "Аб мінімальнай заработнай плаце і дзяржаўных гарантыях у галіне аплаты працы" (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., N 2, арт. 27).

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С.ШУШКЕВІЧ.

17 чэрвеня 1993 г.
г. Мінск.
№ 2433-XII

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб дзяржаўнай экалагічнай экспертызе

Артыкул 1. Мэты дзяржаўнай экалагічнай экспертызы

Дзяржаўная экалагічная экспертыза, вырашаючы задачы, вызначаныя Законам Рэспублікі Беларусь "Аб ахове навакольнага асяроддзя", праводзіцца ў мэтах:

вызначэння ўзроўню экалагічнай небяспекі, якая можа ўзнікнуць у працэсе ажыццяўлення гаспадарчай і іншай дзейнасці цяпер або ў будучым і прама або ўскосна аказаць адмоўнае ўздзеянне на стан навакольнага асяроддзя і здароўе насельніцтва;

ацэнкі адпаведнасці планаемай, праектуемай гаспадарчай і іншай дзейнасці патрабаванням прыродаахоўнага заканадаўства;

вызначэння дастатковасці і абгрунтаванасці мер па ахове навакольнага асяроддзя, якія прадугледжваюцца праектам.

Артыкул 2. Месца дзяржаўнай экалагічнай экспертызы ў сістэме прыняцця рашэнняў

Дзяржаўная экалагічная экспертыза з'яўляецца абавязковым элементам працэсу планавання, праектавання і прыняцця рашэнняў аб сацыяльна-эканамічным развіцці рэспублікі, ажыццяўлення гаспадарчай і іншай дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Заказчыкамі дзяржаўнай экалагічнай экспертызы выступаюць органы дзяржаўнага кіравання, органы мясцовага самакіравання, юрыдычныя і фізічныя асобы. Экалагічная экспертыза можа праводзіцца таксама па ініцыятыве грамадскасці.

Рэалізацыя праектаў, якія падлягаюць дзяржаўнай экалагічнай экспертызе, без станоўчага заключэння дзяржаўнай экалагічнай экспертызы забараняецца і не падлягае фінансаванню.

Артыкул 3. Асноўныя прынцыпы дзяржаўнай экалагічнай экспертызы

Дзяржаўная экалагічная экспертыза ў Рэспубліцы Беларусь грунтуецца на прынцыпах:

прыярытэту аховы жыцця і здароўя чалавека, гарантыі экалагічнай разнастайнасці, генафонду і біялагічнай разнастайнасці жывёльнага і расліннага свету;

законнасці, комплекснасці, навуковай абгрунтаванасці і галоснасці;

інтэграванай ацэнкі сацыяльна, прыродаахоўных, эканамічных і іншых аспектаў планаваемай гаспадарчай і іншай дзейнасці;

уліку сумарнага ўздзеяння шкодных рэчываў, якія выкідваюцца ў навакольнае асяроддзе, і шкодных фізічных уздзеянняў у выніку існуючай і планаваемай гаспадарчай і іншай дзейнасці;

выканання міжнародных абавязацельстваў Рэспублікі Беларусь.

Прававой асновай дзяржаўнай экалагічнай экспертызы з'яўляюцца гэты Закон, Закон "Аб ахове навакольнага асяроддзя", іншыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь у галіне аховы навакольнага асяроддзя.

Артыкул 4. Правядзенне дзяржаўнай экалагічнай экспертызы

Дзяржаўную экалагічную экспертызу ў Рэспубліцы Беларусь праводзяць спецыялізаваныя экспертныя падраздзяленні органаў Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па экалогіі з удзелам у неабходных выпадках іншых органаў дзяржаўнага кантролю ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, а таксама з улікам заключэння грамадскай экалагічнай экспертызы.

У выпадку неабходнасці Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па экалогіі або яго органы на месцах для правядзення экалагічнай экспертызы могуць ствараць экспертныя камісіі з прыцягненнем у якасці пазаштатных экспертаў спецыялістаў розных галін народнай гаспадаркі, навукова-даследчых, праектных інстытутаў, вышэйшых навучальных устаноў, грамадскіх аб'яднанняў.

Артыкул 5. Аб'екты дзяржаўнай экалагічнай экспертызы

Дзяржаўнай экалагічнай экспертызе падлягаюць:

перадпланавая, перадпраектная і праектная дакументацыя па гаспадарчай і іншай дзейнасці, якая можа аказаць адмоўнае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе;

праекты планаў /праграм/, асноўных напрамкаў, схем развіцця і размяшчэння прадукцыйных сіл і галін народнай гаспадаркі;

дзеючыя прадпрыемствы, ваенныя, навуковыя і іншыя аб'екты незалежна ад форм уласнасці;

экалагічны стан асобных рэгіёнаў і мясцовасцей, населеных пунктаў.

Дзяржаўнай экалагічнай экспертызе падлягаюць іншыя праекты, рашэнні, сістэмы, аб'екты, укараненне, рэалізацыя, эксплуатацыя якіх могуць прывесці да парушэння норм экалагічнай бяспекі.

Артыкул 6. Парадак прадстаўлення дакументацыі на дзяржаўную экалагічную экспертызу

Да прыняцця рашэння аб рэалізацыі планаемай гаспадарчай або іншай дзейнасці заказчык дзяржаўнай экалагічнай экспертызы прадстаўляе ў спецыялізаванае экспертнае падраздзяленне органаў Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па экалогіі дакументацыю, якая характарызуе ўзровень экалагічнай бяспекі планаемай дзейнасці, змяшчае пералік неабходных прыродаахоўных мерапрыемстваў, уключаючы матэрыялы па ацэнцы ўздзеяння гэтай дзейнасці на навакольнае асяроддзе /АУНА/, а таксама матэрыялы ўзгаднення з органамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання.

Парадак прадстаўлення, аб'ем і склад дакументацыі, якая накіроўваецца на дзяржаўную экалагічную экспертызу, устанаўліваюцца Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па экалогіі.

Спецыялізаваныя экспертныя падраздзяленні органаў Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па экалогіі, экспертныя камісіі маюць права запытваць і бязвыплатна атрымліваць ад усіх юрыдычных і фізічных асоб, якія знаходзяцца на тэрыторыі рэспублікі, інфармацыю, неабходную для правядзення дзяржаўнай экалагічнай экспертызы.

Артыкул 7. Тэрміны правядзення дзяржаўнай экалагічнай экспертызы

Тэрміны правядзення дзяржаўнай экалагічнай экспертызы вызначаюцца спецыялізаванымі экспертнымі падраздзяленнямі органаў Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па экалогіі, але, як правіла, не павінны перавышаць двух месяцаў.

У выключных выпадках тэрмін правядзення дзяржаўнай экалагічнай экспертызы можа быць прадоўжаны старшынёй Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па экалогіі, але не больш чым на тры месяцы.

Артыкул 8. Заключэнне дзяржаўнай экалагічнай экспертызы

Па выніках правядзення дзяржаўнай экалагічнай экспертызы Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па экалогіі або яго органы на месцах выдаюць заключэнне, якое змяшчае ацэнку ўзроўню экалагічнай бяспекі планаемай гаспадарчай або іншай дзейнасці і вывады аб мэтазгоднасці /немэтазгоднасці/ яе рэалізацыі.

Заключэнне дзяржаўнай экалагічнай экспертызы зацвярджаецца кіраўніцтвам Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па экалогіі або яго органаў на месцах.

Пры выдачы адмоўнага заключэння Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па экалогіі або яго органамі на месцах могуць вызначацца ўмовы, пры выкананні якіх планаемая гаспадарчая або іншая дзейнасць магчымая.

Кантроль за выкананнем заказчыкам патрабаванняў заключэння дзяржаўнай экалагічнай экспертызы ажыццяўляе Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па экалогіі і яго органы на месцах. У выпадку невыканання заказчыкам гэтых патрабаванняў Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па экалогіі і яго органы на месцах маюць права прыпыняць далейшыя работы /праектаванне, будаўніцтва, эксплуатацыю/, патрабаваць ад устаноў банкаў прыпыняць фінансаванне гэтай дзейнасці, а ў неабходных выпадках перадаваць матэрыялы ў следчыя органы для прыцягнення да адказнасці асоб, вінаватых у невыкананні патрабаванняў заключэння дзяржаўнай экалагічнай экспертызы, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 9. Абскарджанне заключэння дзяржаўнай экалагічнай экспертызы

У выпадку нязгоды з заключэннем дзяржаўнай экалагічнай экспертызы заказчык мае права на працягу аднаго месяца з дня выдачы дадзенага заключэння абскардзіць яго ў вышэйстаячыя органы Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па экалогіі.

Пры нязгодзе заказчыка з рашэннем вышэйстаячага органа па пытанню, якое разглядаецца, заключэнне дзяржаўнай экалагічнай экспертызы можа быць абскарджана ў гаспадарчы суд.

Артыкул 10. Адказнасць экспертаў

Эксперты нясуць устаноўленую заканадаўчымі і іншымі нарматыўнымі актамі Рэспублікі Беларусь адказнасць за:

аб'ектыўнасць ацэнкі дакументаў, прадстаўленых на экспертызу;

адпаведнасць заключэння дзяржаўнай экалагічнай экспертызы патрабаванням заканадаўства па ахове навакольнага асяроддзя, патрабаванням міжнародных дагавораў, канвенцый, пагадненняў;

навуковую абгрунтаванасць свайго заключэння і захаванне тэрмінаў разгляду дакументацыі.

Артыкул 11. Фінансаванне дзяржаўнай экалагічнай экспертызы

Дзяржаўная экалагічная экспертыза, якая ажыццяўляецца спецыялізаванымі экспертнымі падраздзяленнямі Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па экалогіі і яго органаў на месцах, фінансуецца за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту.

Правядзенне дзяржаўнай экалагічнай экспертызы на аснове гаспадарчых дагавораў з заказчыкам экспертызы не дапускаецца.

Аплата расходаў, звязаных з правядзеннем дзяржаўнай экалагічнай экспертызы, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з парадкам, які ўстанаўліваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 12. Адказнасць заказчыка дзяржаўнай экалагічнай экспертызы

Заказчык дзяржаўнай экалагічнай экспертызы нясе ўстаноўленую заканадаўствам адказнасць за:

наўмыснае прадстаўленне няпоўнай, навукова неабгрунтаванай і недакладнай інфармацыі;

невыкананне або няякаснае выкананне неабходных навукова-даследчых і праектна-вышукальных работ для ацэнкі ўплыву планаемай дзейнасці на стан навакольнага асяроддзя;

ухіленне ад абмеркавання з грамадскасцю планаемай гаспадарчай або іншай дзейнасці і ўтойванне магчымых негатыўных вынікаў;

невыкананне ўмоў, выкладзеных у заключэнні дзяржаўнай экалагічнай экспертызы.

Прыцягненне да адказнасці не вызваляе вінаватых асоб ад абавязку пакрыцця шкоды, прычыненай імі ў выніку гаспадарчай дзейнасці, якая парушае заканадаўства аб ахове навакольнага асяроддзя.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С.ШУШКЕВІЧ.

18 чэрвеня 1993 г.
г.Мінск.
N 2442—XII

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь "Аб дзяржаўнай экалагічнай экспертызе"

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь пастанаўляе:

1. Увесці ў дзеянне Закон Рэспублікі Беларусь "Аб дзяржаўнай экалагічнай экспертызе" з дня апублікавання.

2. Да прывядзення заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб дзяржаўнай экалагічнай экспертызе" акты дзеючага заканадаўства Рэспублікі Беларусь прымяняюцца ў частцы, якая не супярэчыць дадзенаму Закону.

3. Даручыць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у трохмесячны тэрмін з дня апублікавання:

прадставіць у Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прапановы аб прывядзенні заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб дзяржаўнай экалагічнай экспертызе", а таксама прывесці рашэнні ўрада Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з указаным Законам;

забяспечыць перагляд і адмену міністэрствамі, дзяржаўнымі камітэтамі, ведамствамі Рэспублікі Беларусь нарматыўных актаў, якія супярэчаць Закону Рэспублікі Беларусь "Аб дзяржаўнай экалагічнай экспертызе";

распрацаваць і зацвердзіць парадак аплаты расходаў, звязаных з правядзеннем дзяржаўнай экалагічнай экспертызы.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С.ШУШКЕВІЧ.

18 чэрвеня 1993 г.
г.Мінск.
N 2443—XII

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб справаздачы Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь аб рэалізацыі грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь за 1992 год і дакладзе аб Асноўных напрамках грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь на 1993 год

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Прыняць да ведама справаздачу Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь аб рэалізацыі грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь за 1992 год. Адзначыць недастатковасць мер, якія прымаюцца Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь і Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь па правядзенню самастойнай грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

2. Пагадзіцца з прадстаўленымі Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь і Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь на 1993 год.

3. Нацыянальнаму банку Рэспублікі Беларусь і Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь прадоўжыць перагаворы з Расійскай Федэрацыяй і іншымі ўдзельнікамі Садружнасці Незалежных Дзяржаў аб заключэнні валютнага саюза з ускладаннем функцый эмісіі агульнай грашовай адзінкі на Міждзяржаўны банк.

Нацыянальнаму банку Рэспублікі Беларусь узгадніць з Цэнтральным банкам Расійскай Федэрацыі памер крэдытнай эмісіі і ўліковай працэнтнай стаўкі на трэці і чацвёрты кварталы бягучага года.

У выпадку недасягнення згоды на аснове роўнасці і ўзаемнай выгады Нацыянальнаму банку Рэспублікі Беларусь і Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь інфармаваць Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь аб неабходнасці і ўмовах увядзення нацыянальнай валюты на ўмовах, узгодненых з Расійскай Федэрацыяй без выхаду з рублёвай зоны.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С.ШУШКЕВІЧ.

7 ліпеня 1993 г. г.Мінск. № 2471-XII

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб прадастаўленні прадпрыемствам, аб'яднанням і арганізацыям ільгот пры вылічэнні дадатковага падатку на суму перавышэння нарміруемай велічыні сродкаў, што накіроўваюцца на аплату працы

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Пры вылічэнні ў 1993 годзе прадпрыемствамі, аб'яднаннямі і арганізацыямі дадатковага падатку на суму перавышэння нарміруемай велічыні сродкаў, што накіроўваюцца на аплату працы, са сродкаў на аплату працы выключаюцца сумы фінансавай дапамогі на кампенсаванне сваім работнікам часткі першапачатковага ўзносу на будаўніцтва кватэр у дамах жыллёва-будаўнічых кааператываў, а таксама на пагашэнне запазычанасцей па пазыках банка, атрыманых на будаўніцтва кватэр у дамах кааператываў, індывідуальных жылых дамоў, і па працэнтах за карыстанне банкаўскімі крэдытамі.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С.ШУШКЕВІЧ.

17 чэрвеня 1993 г. г.Мінск. № 2434-XII

После долгих отсрочек Верховный Совет Республики Беларусь принял в первом чтении Закон "Об отходах производства и потребления", который, на мой взгляд, является одним из важнейших законов из пакета законов по проблемам окружающей среды. Думается, нет нужды подробно останавливаться на необходимости принятия такого закона. Ведь даже человек, самая совершенная машина в мире, не работает по безотходной технологии, а, значит, отходы всегда были, есть и будут, и вопрос сокращения их количества, переработки, использования, захоронения требует самого пристального внимания и законодательного обеспечения.

Какие, на мой взгляд, основные положения должен решать новый закон, и как он их решает? В первую очередь он должен заложить правовую базу экономического стимулирования сбора, переработки всех видов отходов, так как другого способа не завалить землю отходами не существует, тем более не может быть в условиях рыночной экономики. Безусловно, получать многие виды продукции из основного, природного сырья технологически проще, зачастую значительно дешевле, чем из вторичного сырья. Многие виды отходов на уровне существующих технологий вообще невозможно переработать. Нужны принципиально новые технологии, новые производства. Все это требует привлечения материальных ресурсов. Закон статьей 13 предусматривает меры экономического стимулирования использования отходов. Но опять-таки, на мой взгляд, меры эти в законе чересчур абстрактны. Хотелось бы иметь в законе конкретный перечень мер экономического стимулирования работы с отходами. Необходимо конкретно установить, что государство будет дотировать производства, перерабатывающие и использующие отходы до такого уровня себестоимости, который соответствовал бы себестоимости продукции, получаемой из традиционных видов естественного сырья.

Естественно, экономическое стимулирование работы с отходами должно органически сочетаться с экономической поддержкой работ по переходу к малоотходным технологиям, сокращению отходов и выбросов в окружающую среду, санкциями за получение отходов сверх установленных норм и лимитов, мерами наказания за размещение отходов вне специально отведенных мест, сбрасывание их в лесные массивы, карьеры, бытовую и ливневую канализации, водоемы и водотоки.

Важным элементом закона является регламентирование порядка сохранения, переработки и захоронения отходов, что достаточно подробно сделано в законе, а вот вопросы трансграничной перевозки отходов и ввоза их на территорию нашего государства, на мой взгляд, в нем рассмотрены недостаточно. Посвященная этому статья 11 носит отсылочный характер, позволяя давать такие разрешения в исключительных случаях, причем не известно, кто имеет право это делать на основании специального положения, утверждаемого Советом Министров.

Что касается ввоза в республику отходов, например, для их переработки или захоронения, то, по-моему, это вообще должно быть законодательно запрещено. Но в нашем законе этого нет.

Еще один, по-моему, очень важный вопрос — это вопрос размещения объектов переработки и мест захоронения отходов, в том числе промышленных токсичных отходов, некачественных ядохимикатов и гербицидов. Закон совершенно правильно запрещает захоронение в могильниках вредных отходов, я сказал бы, вообще отходов на территории городов, других населенных пунктов, в водных объектах, подземных водоносных горизонтах, курортно-оздоровительных зонах и других местах, где может быть создана опасность ухудшения состояния окружающей среды и здоровья населения. Но здесь сразу же встает вопрос: "А где же их захоронить?". Любой местный Совет, естественно, не даст разрешения на создание, скажем, могильника на его территории. Ведь, как правило, привозимые в могильник отходы получены даже не на его территории, а в том городе или поселке, где их захоранивать нельзя.

Очевидно, в закон нужен дополнительный пункт, позволяющий принимать решения о местах размещения могильников и предприятий по переработке отходов без согласования с местными органами самоуправления, так сказать, волевым путем, на основании заключения специалистов и органов экологической экспертизы. Соответственно потребуется внесение поправок в Закон о местном самоуправлении. Есть вещи, которые выше местных, скажем прямо, местнических настроений.

Все поднимаемые вопросы так или иначе затронуты в законе, нашли в нем свое отражение, но нет пределов совершенствованию, и хотелось бы до предоставления закона на очередную сессию Верховного Совета для обсуждения во втором чтении получить как можно больше замечаний и предложений от организаций, учреждений и отдельных лиц. Естественно, что готовящая закон постоянная Комиссия Верховного Совета по вопросам экологии и рационального использования природных ресурсов будет признательна всем авторам замечаний и предложений.

Председатель постоянной Комиссии Верховного Совета Республики Беларусь по вопросам экологии и рационального использования природных ресурсов, доктор биологических наук, профессор, академик МАЭ Б.П.САВИЦКИЙ.

Праект

Унесены Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь і Камісіяй па пытаннях экалогіі і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб адходах вытворчасці і спажывання

Закон заклікаНы садзейнічаць прадухіленню адмоўнага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе і чалавека пры абыходжанні з адходамі і максімальнаму ўключэнню іх у гаспадарчы абарот як дадатковай крыніцы сыравіны.

У дадзеным Законе выкарыстоўваюцца наступныя тэрміны:

адходы вытворчасці - астаткі сыравіны, матэрыялаў, паўфабрыкатаў, якія ўтвараюцца ў працэсе вытворчасці прадукцыі або выканання работ і страцілі поўнасцю або часткова зыходныя спажывецкія якасці, а таксама спадарожныя рэчывы, што ўтвараюцца ў працэсе вытворчасці і не знаходзяць прымянення. У адходы вытворчасці ўключаюцца ўтрымальныя і раскрыўныя пароды, якія ўтвараюцца пры здабыванні карысных выкапняў, пабочныя і спадарожныя прадукты;

адходы спажывання - вырабы і матэрыялы, страціўшыя свае спажывецкія ўласцівасці ў выніку фізічнага ці маральнага іх зносу. Да адходаў спажывання належаць і цвердыя бытавыя адходы /ЦБА/, якія ўтвараюцца ў выніку жыццядзейнасці людзей;

небяспечныя адходы - адходы, якія ў выніку іх рэакцыйнай здольнасці або таксічнасці ствараюць непасрэдную ці патэнцыяльную небяспеку для здароўя чалавека або стану навакольнага асяроддзя самастойна ці пры ўступленні ў кантакт з іншымі рэчывамі /адходамі/ і навакольным асяроддзем;

абарачэнне - вытворчасць, апрацоўка, упакоўка, захоўванне, траспарціроўка, назапашванне, выкарыстанне, разбурэнне, пераўтварэнне, падрыхтоўка да продажу, захаванне або іншыя падобныя дзеянні;

рэкуперацыя адходаў - атрыманне зноў выкарыстанага раней рэчыва, якое ўтрымліваецца ў адходах вытворчасці, выкарыстанне цяпла хімічных рэакцый;

трансгранічная перавозка - любое перамяшчэнне адходаў з раена, які знаходзіцца пад нацыянальнай юрысдыкцыяй іншай дзяржавы, у раен або праз раен, што знаходзіцца пад нацыянальнай юрысдыкцыяй Рэспублікі Беларусь.

Раздзел I. Агульныя палажэнні

Артыкул 1. Сфера прымянення Закона

Гэты Закон распаўсюджваецца на ўсіх суб'ектаў гаспадарання, незалежна ад форм уласнасці, зарэгістраваных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць без стварэння юрыдычнай асобы, а таксама грамадзян.

Закон рэгулюе адносіны, што ўзнікаюць у працэсе работы з адходамі пры:

распрацоўцы радовішчаў карысных выкапняў і перапрацоўцы мінеральнай сыравіны;

вытворчасці, транспарціроўцы і захоўванні прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння, тавараў народнага спажывання, энергіі і энерганосьбітаў;

вытворчасці будаўнічых, сельскагаспадарчых, горных і іншых работ, а таксама пры аказанні розных паслуг;

фізічным і маральным зносе асноўных і абарачальных сродкаў;

спажыванні насельніцтвам прамысловых і харчовых тавараў.

Пры выкарыстанні і выдаленні радыеактыўных адходаў, асадкаў сцекавых вод павінны захоўвацца як патрабаванні дадзенага Закона, так і спецыяльных заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 2. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб абыходжанні з адходамі

Адносіны ў галіне абыходжання з адходамі рэгулююцца гэтым Законам, Законам "Аб ахове навакольнага асяроддзя", іншымі нарматыўнымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Раздзел II. Органы дзяржаўнай улады і кіравання ў галіне абыходжання з адходамі

Артыкул 3. Кампетэнцыя Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у галіне абыходжання з адходамі

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь у галіне абыходжання з адходамі:

заканадаўча забяспечвае эканамічнае стымуляванне збору і перапрацоўкі адходаў;

ажыццяўляе міждзяржаўнае супрацоўніцтва ў галіне абыходжання з адходамі;

распрацоўвае і прымае заканадаўчыя акты ў галіне абыходжання з адходамі;

па прадстаўленню кампетэнтных органаў і ўзгадненню з мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў вызначае межы зямельных участкаў пад месцы складзіравання /размяшчэння/, захавання ў магільніках і перапрацоўкі адходаў /пастановамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета/;

разглядае іншыя пытанні ў галіне абыходжання з адходамі.

Артыкул 4. Кампетэнцыя мясцовых Саветаў народных дэпутатаў у галіне абыходжання з адходамі

Да каметэнцыі мясцовых Саветаў народных дэпутатаў у галіне абыходжання з адходамі адносяцца:

арганізацыя і каардынацыя дзейнасці ўсіх прадпрыемстваў і арганізацый, якія знаходзяцца на іх тэрыторыі, з мэтай выяўлення адходаў і ўключэння іх у гаспадарчы абарот;

аб'яднанне пры неабходнасці і мэтазгоднасці сродкаў юрыдычных асоб, грамадзян, мясцовага бюджэту і пазабюджэтных фондаў для фінансавання будаўніцтва новых, расшырэння і рэканструкцыі дзеючых аб'ектаў па апрацоўцы, перапрацоўцы другаснай сыравіны;

арганізацыя ліквідацыі адходаў за кошт іх уладальнікаў разам з прад'яўленнем запатрабавання аб спагнанні ўрону за шкоду, прычыненую навакольнаму асяроддзю адходамі вытворчасці і спажывання;

забяспячэнне насельніцтва інфармацыяй па абыходжанню з адходамі, стану іх захоўвання і перапрацоўкі ў рэгіёне;

